*Людміла Ражкова*

## ДА ПЫТАННЯ АБ ПЕДАГАГІЧНЫМ ПАТЭНЦЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРА

У навуковых артыкулах і дысертацыйных даследаваннях навукоўцы неаднаразова звярталіся да праблемы фарміравання асобы сродкамі фальклору. Нават і сёння, на пачатку XXI стагоддзя ён разглядаецца як адметная з'ява культуры сучаснага грамадства, здольная абараніць ад бездухоўнасці і амаральнасці, выратаваць ад этнічнага самазнішчэння. І сапраўды, гэтае меркаванне мае рацыю. Традыцыйная народная культура паўстае перад сучаснікамі як нацыянальная каштоўнасць, як падмурак нацыянальнай культуры, гарант захаванасці этнічнай своеасаблівасці беларускай культуры і нацыянальнай мовы. У той жа час, вопыт выкарыстання педагагічнага патэнцыялу фальклору даволі супярэчлівы. Трэба прызнаць той факт, што тое, што сёння прэзентуецца як фальклор на занятках у школе і ўстановах культуры, фальклорам на самой справе не з'яўляецца. Узоры фальклорнай спадчыны разглядаюцца ці як музейныя экспанаты, ці як формы баўлення вольнага часу, відовішчы, забавы, але не як частка сямейнага і сацыяльнага жыцця. Што трэба зрабіць, каб фальклор усё ж такі знайшоў сваё месца ў педагагічных сістэмах сучаснасці? Паспрабуем пашукаць адказ на пастаўленае пытанне. У фалькларыстыцы канстатуецца, што фальклор – гэта калектыўнасць творчага працэсу як дыялектычнага адзінства індывідуальнай і масавай творчасці, традыцыйнасць, вуснасць, поліэліментнасць, поліфункцыянальнасць [2]. Педагогі чамусьці выпускаюць з віду гэты бок існавання традыцыйнай народнай культуры.

Традыцыйную культуру разглядаюць ці як унутрысітуатыўнае мастацтва (эстэстычны падыход) ці як мастацкі арганізаванае жыццё (сацыялагічны падыход). Згарманізаваць гэтыя два падыходы зусім няпроста. Магчыма, што тут патрэбны і трэці падыход – псіхалагічны [1]. Але, па словах Э.Я. Аляксеева, фалькларыстыка яшчэ не здольна апісаць свой прадмет з названых трох пазіцый і таму вернемся да таго, што ўжо вядома і не вызывае сумненняў.

Зараз нам цяжка ўявіць сабе такое ўзаемаперапляценне мастацтва і жыцця, дзе было б немагчыма аддзяліць адно ад другога. Але, менавіта гэтае адзінства і фарміравала асаблівы стыль народнага жыцця. Перш-наперш, фальклорная культура прадвызначае, што суб'ект фальклорнай сітуацыі ў большасці выпадкаў не вольны, а заняты якой-небудзь дзейнасцю, працай. А.Хаўзер казаў з гэтае нагоды, што "фальклор не столькі прадукт, колькі дзейнасць" [3]. Прадукты такой дзейнасці няўлоўныя. Фальклорны твор кожны раз ствараецца нанава і існуе толькі непасрэдна ў момант выканання, акрамя, можа быць, прадметаў дэкаратыўна-ўжытковага характару. Фальклорная дзейнасць увесь час знаходзіцца ў сярэдзіне якой-небудзь іншай дзейнасці, заўсёды ўнутры жыццёвай сітуацыі, здарэння. Таму і вызначаецца гэтая яе якасць як "унутрысітуатыўнасць" (па Ю.М.Кулікову).

У педагагічнай літаратуры ёсць тлумачэнні выхаваўчай функцыі фальклору. Яны звязаны не толькі з выкарыстаннем асобных жанраў фальклора з мэтай спецыяльнага (працоўнага, разумовага, рэлігійнага, эстэтычнага, фізічнага, патрыятычнага) выхавання малодшага пакалення, але і з усведамленнем магчымасці фальклорнай спадчыны выступаць сродкам цэласнай сацыялізацыі асобы. Педагагічны патэнцыял фальклору раскрываецца праз спасціжэнне педагагічнай ідэі, якая існуе ў змесце фальклорнага твору. Але ў кола інтарэсаў навукоўцаў, якія даследуюць праблемы народнай педагогікі (Г.П.Арлова, У.Ф.Валадзько, Л.М.Варанецкая, Г.М.Волкаў, А.А.Грымаць і іншыя) пападаюць, чамусьці, не ўсе жанры дзіцячага фальклору, а толькі іх частка: прыказкі, прымаўкі, казкі, лічылкі, гульні, скарамоўкі. Названыя жанры ўтрымліваюць у сабе нейкі маральны звод правіл і патрабаванняў, якія разглядаюцца як асобна, так і ў сувязі з якім-небудзь відам выхавання. Тэхналогія рэалізацыі выхаваўчага ўздзеяння фальклору на асобу бачыцца педагогам як непасрэднае моўна-дыдактычнае навучанне.

Гэта добра, але незразумела, чаму ў якасці сродкаў выхавання выступаюць толькі паэтычныя жанры фальклорнай творчасці. А дзе ж інструментальныя, песенныя, танцавальныя, дэкаратыўна-прыкладныя і драматычныя формы фальклорнай спадчыны? Вывучэнне толькі паэтычных жанраў значна звужае і збядняе ўяўленні аб яго педагагічным патэнцыяле. Фальклор у гэтым ракурсе паўстае перад намі вельмі спрошчана і толькі чатскай цэлага. Да таго ж музычны і вербальны тэксты разглядаюцца паасобку. Але ж фальклор – гэта комплекс элементаў, куды акрамя слова уваходзяць яшчэ мелодыя і рух, і характаразуецца такой натуральнай ўзаемапераплеценасцю, непадзельнасцю, што называюць яго сінкрэтызмам, у процілегласць пазнейшаму сінтэтызму. Не прымаецца да ўвагі і той факт, што фальклор з'яўляўся неад'емнай часткай паўсядзёнага і святочнага жыцця сялянскай абшчыны і мае своеасаблівы бытавы кантэкст. Гэта значыць што фальклор і само жыццё знаходзяцца ў "натуральным адзінстве".

Нам могуць запярэчыць, што такі падыход да вывучэння педагагічнага патэнцыялу фальклору вельмі шырокі. І таму выхаваўчая роля фальклору не вельмі выразная. Што па-за комплекснымі з'явамі народнай культуры (абрадамі, звычаямі, традыцыямі), якія арганізуюць усё жыццё сялянскай абшчыны ў адзіны цэласны выхаваўчы працэс не вельмі выразна бачны фактары і механізмы выхаваўчага ўздзеяння фальклору на асобу. Адказам на падобныя закіды можна лічыць пазіцыю У.І.Сітнікава. "Лагічна дапусціць, што тут сваю ролю адыгрываюць, нябачныя на першы погляд, але фактычна існуючыя, асаблівасці функцыяніравання фальклорнай творчасці: традыцыйнасць, вуснасць, сінкрэтызм, унутрысітуацыйнасць і калектыўнасць" [4].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, педагагічны патэнцыял фальклорнай творчасці мы вызначаем як сукупнасць умоў і фактараў, якія аказваюць выхаваўчае ўздзеянне на асобу. Гэтую сукупнасць умоўна можна падзяліць на дзве часткі: адна з іх складаецца з педагагічных ідэй, інфармацыі, кода, заключаных у паэтычным змесце фальклорнага твору і яго ладава-меладычна-рытмічнай пабудове, а другую ўтвараюць спецыфічныя спосабы існавання традыцыйнай народнай творчасці (унутрысітуацiўнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм).

У выніку трэба падкрэсліць, што на пачатку XXI стагоддзя фальклор усё яшчэ з'яўляецца надзейным сродкам выхавання асобы. Але, як ўжо згадвалася, фальклор – гэта вельмі складанае утварэнне, якое мае свае ўнутраныя і знешнія сувязі і выступае ў якасці сістэмы. Фальклор - гэта само жыццё, ўнутрысітуатыўная, няўлоўная з'ява, якая з цягам часу ставіць перад даследчыкамі ўсё новыя і новыя пытанні, адкрывае ўсё новыя і новыя грані свайго існавання. Менавіта таму, многія пытанні, якія звязаны з ім, сёння не могуць быць вырашаны раз і назаўсёды. Рашэнне праблемы выхаваўчага патэнцыялу фальклора ў педагагічнай навуцы пакуль што суадносіцца толькі з вузкім яго вызначэннем як "мастацтва слова". Мы ж прапануем разглядаць гэтае пытанне ў суадносінах з яго вызначэннем мастацкі арганізаванага жыцця. Гэта, несумненна, ускладніць яго вывучэнне, але і ўзбагаціць нашы ўяўленні аб ім і яго ўздзеянні на асобу.

**Спіс літаратуры:**


1. Алексеев, Э. Е. Методологические проблемы фольклористики / Э. Е. Алексеев // Проблемы методологии современного искусствознания : сб. ст. / АН СССР, НИИ искусствознания. – М., 1989. – С. 223–241.
2. Гусев, В. Е. Фольклор / В. Е. Гусев // Восточнославянский фольклор : словарь науч. и нар. терминологии / редкол.: К. П. Кабашников [и др.]. – Минск, 1993. – С. 376–378.
3. Куликов, Ю. Н. О социально-культурной природе традиционного фольклора / Ю. Н. Куликов // Социологические аспекты изучения музыкального фольклора : сб. ст. – Алма-Ата, 1978. – С. 14.
4. Ситников, В. И. Теоретико-методологические основы совершенствования подготовки руководителей коллективов фольклорной самодеятельности : дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / В. И. Ситников. – СПб., 1992. – С. 29.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ